# НАВІНЫ, ПАДЗЕІ, ФАКТЫ

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Каралеўства Швецыі ў Рэспубліцы Беларусь Марцін Оберг у межах свайго афіцыйнага візіту на Віцебшчыну наведаў наш універсітэт, дзе сустрэўся са студэнтамі, магістрантамі, аспірантамі, прафесарска-выкладчыцкім складам і кіраўніцтвам. Падчас сустрэчы дырэктар Цэнтра шведскіх даследаванняў Анастасія Майская з дапамогай прэзентацыі пазнаёміла прысутных з магчымасцямі навучання беларускіх студэнтаў у Швецыі. У прыватнасці, яна расказала пра стыпендыяльныя праграмы (праграма Вісбю для магістрантаў, праграма Вісбю для аспірантаў, праграма Вісбю на шведскай мове), прадугледжаныя шведскай адукацыяй. Падрабязней пазнаёміцца з праграмамі навучання можна на сайце Шведскага інстытута *www.si.se* і на сайце пра навучанне ў Швецыі *www.studyinsweden.se*.

***

Першае ў бягучым навучальным годзе пасяджэнне савета ўніверсітэта прайшло 29 верасня. На пачатку савета былі ўручаны нагрудныя знакі «Выдатнік адукацыі» дацэнту кафедры псіхалогіі Т.Я. Касарэўскай і дацэнту кафедры заалогіі С.І. Дзянісавай.

На пасяджэнні абмяркоўваліся вынікі прыёмнай кампаніі 2016 года і акрэсліваліся задачы па наборы студэнтаў у 2017 годзе. З асноўным дакладам выступіў адказны сакратар прыёмнай камісіі А.В. Лукомскі. Удзел у абмеркаванні прынялі прарэктар па вучэбнай рабоце В.І. Турко ўскі, дэкан матэматычнага факультэта А.М. Залеская, дэкан юрыдычнага факультэта А.А. Бачкоў, дырэктар Полацкага каледжа Т.Г. Полушкіна і дырэктар Аршанскага каледжа А.А. Зулёў.

***

У віцебскім Мастацкім музеі адчынілася выстава Людмілы і Міхася Цыбульскіх пад назвай «Феерыя колераў: ад эцюда да кампазіцыі».

Міхась Леанідавіч – дацэнт кафедры выяўленчага мастацтва мастацка-графічнага факультэта нашага ўніверсітэта, выбітны мастацтвазнаўца і мастак. Многія ведаюць Міхася Цыбульскага як арганізатара шматлікіх выстаў, у тым ліку міжнародных, куратара праектаў і, безумоўна, як уладальніка ганаровага звання «Чалавек года Віцебшчыны».

Яго жонка Людміла скончыла тэхналагічны ўніверсітэт, больш за 30 год працуе на ААТ «Віцебскія дываны». Яна прымала ўдзел у міжнародных мастацкіх выставах і пленэрах, у тым ліку ў выставе вырабаў для інтэр'ера ў Гановеры (Германія). Дызайнерскія дываны Людмілы неаднаразова прызнаваліся найлепшымі, а сама яна як лепшы дызайнер у 2010 годзе кіраўніцтвам Віцебскага аблвыканкама была ўзнагароджана спецыяльным прызам.

***

Студэнцкі савет універсітэта разам з Тэрытарыяльным цэнтрам сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Кастрычніцкага раёна горада Віцебска арганізавалі і правялі сумесную акцыю, прымеркаваную да Дня пажылога чалавека. На працягу тыдня студэнты розных факультэтаў дапамагалі пенсіянерам: перакопвалі агароды, прыбіралі прысядзібныя участкі, збіралі яблыкі, уцяплялі на зіму вокны.

***

У чацвёрты раз у нашым універсітэце прайшла спартландыя «А ну-ка, перваки!». Удзельнічалі ў спаборніцтвах каманды інтэрнатаў, у склад якіх увайшлі студэнты першых курсаў усіх факультэтаў, у тым ліку і замежныя грамадзяне. Арганізавалі і правялі спаборніцтвы інструктары спартыўнага клуба нашага ўніверсітэта І.Г. Шатуха, А.І. Серабракоў, П.І. Яско і А.А. Батуркін пад кіраўніцт-

вам галоўнага суддзі, кіраўніка спартыўнага клуба А.В. Галавінца. Пераможцамі спартландыі сталі студэнты з інтэрната №5, другое месца заняла каманда інтэрната №4, трэцімі сталі першакурснікі з інтэрната №3. Салодкія прызы і дыпломы дапамагла набыць ПА ГА «БРСМ» універсітэта.

**Алеся ДУБРОЎСКАЯ.**